Document 3a

Ref. Ares(2020)4118110 - 05/08/2020

# Прэзідэнт
# Рэспублікі Беларусь

Мінск, 9 мая 2020 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з нагоды Дня Еўропы.

Пасляваеннае аднаўленне разбуранай гаспадаркі паспрыяла аб'яднанню еўрапейскіх дзяржаў у мэтах будавання бяспечнага свету і ўстойлівага развіцця. Сімвалічна, што папярэднік Еўрапейскага саюза – агульны рынак вугалю і сталі ператварыў сыравіну вайны ў інструмент міру і партнёрства.

Нягледзячы на часовыя цяжкасці, сёння, як і раней, ЕС адыгрывае значную ролю ў падтрыманні стабільнасці на Еўразійскім кантыненце, з'яўляецца гарантам незалежнасці і суверэнітэту еўрапейскіх краін.

Беларусь – прыхільнік доўгатэрміновага супрацоўніцтва і прадказальнасці ў адносінах паміж суседзямі. Вельмі разлічваем на адкрытае і канструктыўнае ўзаемадзеянне з еўрапейскімі партнёрамі па ўсіх напрамках узаемнага інтарэсу.

У гэты святочны дзень жадаю Вашай Экселенцыі здароўя і поспехаў на адказнай палітычнай ніве, а ўсім жыхарам аб'яднанай Еўропы – дабрабыту і згоды.

Прыміце запэўненні ў маёй вельмі высокай павазе.

Аляксандр Лукашэнка

**Яе Экселенцыі**
**Спадарыні Урсуле фон дэр Ляйен**
**Старшыні Еўрапейскай камісіі**
**Брусель**